# «Наша задача - выхаваць уважлівых да прыроды грамадзян»

**Больш за 60 % Віцебскай вобласці займаюць іглічныя лясы, узрост некаторых з іх складае некалькі стагоддзяў. А адметную назву - Беларускае Паазер’е - паўночны рэгіён атрымаў за больш чым 2800 азёр і 500 рэк. На тэрыторыі Віцебшчыны размешчаны таксама дзве буйныя асабліва ахоўныя прыродныя тэрыторыі - Нацыянальны парк «Браслаўскія азёры» і Бярэзінскі біясферны запаведнік, таму тут, як нідзе ў Беларусі, развіты прыродна-рэкрэацыйны адпачынак. Старшыня Віцебскага абласнога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Раман КОЛЦА расказаў аб тым, чым сёння ганарацца эколагі вобласці і якія выклікі дыктуе час.**

- **Раман Фёдаравіч, раздзельны збор смецця з’яўляецца адным з самых прагрэсіўных спосабаў утылізацыі адходаў. Як развіваецца тэты напрамак у Віцебскай вобласці?**

- Тэма вельмі актуальная для нашага рэгіёна, як і для краіны ў цэлым. За год утвараецца каля 400 тыс. т камунальных адходаў, для раздзельнага збору другасных матэрыяльных рэсурсаў (ДМР) функцыянуюць тры смеццесартыравальныя заводы ў Віцебску, Наваполацку і Оршы. Адкрыта 204 прыёмных пункты нарыхтоўкі другаснай сыравіны, 9 ліній сартавання. Для раздзельнага збору смецця выкарыстоўваецца каля 40 тыс. кантэйнераў, іх колькасць павялічваецца з кожным годам (у параўнанні з 2010-м тэты паказчык вырас у дзесяць разоў!). Узровень вымання ДМР з агульнага аб’ёму ў 2018 годзе быў на ўзроўні 20 %, у 2023 - ужо 40 %.

Летась на Біямехзаводзе бытавых другасных рэсурсаў у Наваполацку адкрылі комплекс на паглыбленай пераапрацоўцы шын і гуматэхнічных вырабаў. Тэта ўнікальны аб’ект, дзе адразу можна збіраць, сартаваць, перанрацоў- ваць адходы і выраблЯ ць з іх новую імпартазамяшчальную прадукцыю: гумавую плітку, брукаванку, бардзюры. У 2023 годзе таксама быў уведзены ў эксплуатацыю палігон цвёрдых бытавых адходаў сасмеццеперапрацоўчым комплексам у Оршы. Зараз у Наваполацку вядуцца работы па будаўніцтве рэгіянальнага комплексу па захаванні і перапрацоўцы адходаў, які дазволіць аб’яднаць Полацкі, Расонскі, Ушацкі раёны для работы з ЦБА. Надобных комплексаў на Віцебшчыне да 2035 года плануецца пабудаваць шэсць.

Важную ролю ў раздзельным зборы смецця адыгрывае экавыхаванне насельніцтва з самага дзяцінства. Тэта і «зялёныя школы», установи адукацыі з экалагічнай накіраванасцю, пастаянныя сустрэчы спецыялістаў з дзіцячай аўдыторыяй. Першасная задача для нас - выхаваць беражлівых, уважлівых да навакольнага свету грамадзян.

**- Які напрамак работы патра- буе сёння ад спецыялістаў павышанай увагі?**

Віцебшчына з’яўляецца прамысловым рэгіёнам: на яго тэрыторыі працуе больш за 1300 буйных прадпрыемстваў, такіх як «Нафтан», «Полацк - Шкловалакно», «Даламіт», «Віцязь». Асноўная задача - ажыццяўленне кантролю выкідаў ў паветра забруджвальных рэчываў, сцёкавых вод, абыходжання з адходамі. Немалаважную ролю займае

**Па даных маніторынгу атмасфернага паветра ў Віцебскай вобласці, яно ацэньваецца як добрае і выдатнае. Пдрахімічныя і гідрабіялагічныя паказчыкі вады сведчаць аб добрым стане паверх- невых водных аб’ектаў.**

навядзенне парадку на зямлі ў Цесным узаемадзеянні з мясцовымі органамі ўлады. Не сказаць, што тэты накірунак з’яўляецца праблемным, але ён патрабуе пастаяннай увагі і кантролю.

- **Паўночны рэгіён - самы заражаны інвазіўнымі раслінамі. Якая работа праводзіцца ў вобласці па барацьбе з баршчэўнікам Сасноўскага?**

Барадьба з інвазіўнымі відамі ва ўсім свеце прызнана адной з найбольш важных задач па захаванні біяразнастайнасці. Самым небяспечным з'яўляецца баршчэўнік Сасноўскага: адна расліна на 1 $м^2$ дае да 2 тыс. насення, якое можа захоўвацца ў глебе да 10 гадоў! На долю Віцебскай вобласці прыходзіцца каля 80 % ад плошчы прарастання дадзенай расліны ў рэспубліцы, з іх 26 % - на тэрыторыі Ушацкага раёна. З кожным годам гэтай праблеме надаецца больш увагі, пастаянна ўдасканальваюцца падыходы да арганізацыі і правядзення работ па барацьбе з баршчэўнікам з улікам практыкі прымянення гербіцыдаў на розных катэгорыях зямель, захаванні тэхналогіі іх выкарыстання.

Ва ўсіх раёнах і гарадах Віцебшчыны зацверджаны планы мерапрыемстваў па барацьбе з інвазіўнымі відамі. Сёлета толькі бюджэтамі розных узроўняў на гэты напрамак работы было накіравана 1804 тыс. рублёў. Па стане на 1 верасня 2024 года, хімічным метадам апрацавана больш за 4000 га, механічным - звыш 624 га. Узарана і засеяна травасумесямі больш за 22 га.

Самы эфектыўны метад барацьбы з баршчэўнікам Сасноўскага - хімічны. Ён уключае апрацоўку заражаных плошчаў гербіцыдамі суцэльнага і выбарачнага дзеяння.

- **За апошнія некалькі гадоў у Віцсбскай вобласці ўзрасла папуляцыя бурых мядзведзяў. Дзікая жывёла прыходзіць на сялянскія падворкі і прадстаўляе рэальную пагрозу жыццю грамадзян. Як вырашаецца гэта праблема?**

- Так, колькасць бурых мядзведзяў павялічылася ў цэлым па рэспубліцы. Прычыны розныя: спрыяльныя кліматычныя і прыродныя ўмовы, добрая харчовая база, адсутнасць ворагаў. З'яўленне мядзведзяў было зафіксавана не толькі ў сельскіх населеных пунктах, але і на палігонах, у месцах несанкцыянаванага размяшчэння харчовых адходаў - там, дзе здабыць ежу лягчэй. Ёсць меркаванне, што на колькасць гэтага віда ў вобласці ўплывае сезонная міграцыя з Расійскай Федэрацыі падчас адкрыцця там палявання.

Па даных Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, на 2021 год колькасць бурых мядзведзяў на Віцебшчыне складала ад 419 да 456 асобін. Стан на 2024 год па- куль не вызначаны, навукоўцы яшчэ нраводзяць падлік. Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 11.04.2019 года № 237 «Аб узаемадзеянні дзяржаўных органаў, іншых арганізацый пры выяўленні дзікай жывёлы» вызначаны парадак узаемадзеяння дзяржорганаў, калі жывёла можа прадстаўляць пагрозу жыццю і здароўю грамадзян. Спецыяльная камісія прымае адно з рашэнняў: адлоў або адстрэл. У асноўным, пры з'яўленні мядзведзя прымаюцца прафілактычныя меры: уключаецца сірэна спецаўтамабіляў, гумавы прагон і інш. На сённяшні дзень у Паўночным рэгіёне выпадкаў нападу драпежнай жывёлы на людзей не зафіксавана.

- **Больш за 10 гадоў таму Нацыянальны парк «Браслаўскія азёры» стаў найбольш папулярнай пляцоўкай для адпачынку дзякуючы правядзенню там маштабнага музычнага фестывалю Viva Braslav, але тэта больш адносіцца да падзейнага турызму. Ці развіты ў вобласці экалагічны турызм і якія экафестывалі ўжо сталі брэндамі Віцебшчыны?**

- Штогод з 2012 года ў Міёрскім раёне праводзіцца экалагічны фестываль «Жураўлі і журавіны Міёрскага краю». Менавіта ў верасні на самым вялікім у Беларусі верхавым балоце Ельня, якое займае ў краіне першае мес- ца па запасах журавін, пачынаецца сезон збору. А яшчэ ў гэты перыяд тысячы жораваў спыняюцца на Ельні падчас асенняй міграцыі на некалькі тыдняў адпачынку. Госці і ўдзельнікі фестывалю могуць не толькі паназіраць за шэрымі птушкамі, але і назбіраць багатай вітамінамі ягады.

У жніўні 2024 года ў чацвёрты раз у гарадскім пасёлку Асвея Верхнядзвінскага раёна адбыўся экалагічны фестываль «Асвейскія росы». У праграме свята - знаёмства з мясцовымі прыроднымі помнікамі, турыстычным патэнцыялам.

Фэст выйшаў на міжнародны ўзровень, бо ўдзел у ім, апроч Рэспубліканскага ландшафтнага заказніка «Асвейскі» і дзяржаўнай прыродаахоўнай установы «Экаросы», узяў і Нацыянальны парк «Себежскі» (Расійская Федэрацыя). Для самых маленькіх гасцей свята работнікі «Асвейскага» арганізавалі прагулкі на катэры на востраў Ду самы вялікі востраў у нашай краіне. Дарэчы, раней ён быў населены людзьмі.

Прыродны патэнцыял нашай вобласці вельмі вялікі, наперадзе мноства цікавых экапраектаў.

**- Віцебшчына славіцца сваімі ўнікальнымі прыроднымі багаццямі. У іх ліку - самае глыбокае возера Доўгае, адзінае ў Беларусі возера Лосвіда з падводнай дарогай. Якія аб’екты можна дадаць у гэты спіс, каб захацелася прыехаць менавіта ў Паўночны рэгіён?**

У Браслаўскім раёне возера Рычы, максімальная глыбіня якога 51,9 м, вядома сваёй амаль крыштальнай вадой і рэдкімі ві- дамі раслін. Увогуле ўся сетка Браслаўскіх азёраў - а іх каля 200 - заслугоўвае ўвагі і, безумоўна, пакідае яркі след у душы кожнага, хто завітаў у Беларускае Паазер’е.

Плошча воднага люстэрка возера Асвейскае складае 52,8 км$^2$, максімальная глыбіня - 7,5 м. Гэта робіць яго другім па велічыні возерам Беларусь

Самы вялікі валун знаходзіцца каля вёскі Горкі (Шумілінскі раён), адзіная ў Беларусі пячора прыроднага паходжання - каля вёскі Сахновічы (Глыбоцкі раён). Дубы-веліканы, валуны, рэкі - адным словам, лепш адзін раз убачыць, чым сто разоў пачуць!

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА**